# БЕЛАРУСЬ
# ЯК НАТХНЕННЕ



## ЧАРОЎНЫ КУТ, СТАРЫ КАЗАЧНЫ КРАЙ – НАША БЕЛАРУСЬ.

ЯКАЯ ЯНА, МАЯ ЗЯМЛЯ? ГЭТА ЗАЛАТЫЯ ПАЛІ ЗБАЖЫНЫ З СІНІМІ ВАЧАМІ ВАСІЛЬКОЎ, СВЕТЛЫЯ АД БЯРОЗ ГАІ, ШТО АГЛУХЛІ АД ПТУШЫНАГА ЗВОНУ, І ПУШЧЫ, ДЗЕ ГОРДА НЯСУЦЬ СВАЕ КРОНЫ АЛЕНІ. ГЭТА БЯСКОНЦЫЯ ЖЫЛЫ РЭК, У ЯКІХ ПЛЕШЧУЦЦА БАБРЫ І РЫБЫ НА ЗАХАДЗЕ СОНЦА, І ГЭТА АМАЛЬ АДЗІНАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ АЗЁР, ЧЫСТЫХ, ЯК УСМЕШКА ДЗІЦЯЦІ.

БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА НАДЗВЫЧАЙ ШМАТГРАННАЕ! У ІМ СПАЛУЧАЕЦЦА І НЕВЕРАГОДНАЯ ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКОЙ МЫ МОЖАМ ПАБАЧЫЦЬ ЦУДОЎНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ І КУЛЬТАВЫЯ МЕСЦЫ РОЗНЫХ ЧАСОЎ, ВЫНАХОДНІЦТВЫ І ЭКСПЕРЫМЕНТЫ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКІМ НАША КРАІНА ВЯДОМАЯ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ…




Мастак Вольга Навіцкая

З зямлёй і небам звязывае мяне ніць —
Неразарваная веквечна павуціна:
Зямля мяне галубіць, як вернага сына,
А сонца мне душу не кідае туліць,

Яшчэ ў калысцы я наўчыўся з песень
сніць
Аб гэтых блізкіх мне, а цесных так
мясцінах:
Што роднай нівы я мільённая часціна,
Што зоркі роднай у сэрцы мне іскрынка
тліць…

Янка Купала, "Бацькаўшчына"





Беларусы

Мой край азёрны, край люстраны!
І сёння я з табою ўвесь —
З палямі, з трактарам старанным,
З табою, неўгамонны лес.

Хіба яшчэ аб нейкім шчасці
Памарыць можа чалавек?..
Як неадлучны сын ад маці,
Вось так і я з табой навек!

Пятрусь Броўка, "Мой край азёрны"





Мастак Павел Татарнікаў

На карце вялікага свету
Яна – як зялёны лісток,
Сасмаглая песня лета,
Жывое вады глыток,

Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток...

Васіль Вітка, "Беларусь"






Мастак Гаўрыіл Вашчанка

Яна мне дадзена адзіная
На ўсё жыццё, на цэлы век.
Мая адзіная, радзімая
У вянках лясоў і стужак рэк.

Заўсёды самая прыветная,
Як сонца, свеціцца сама,
Жыве, як мара запаветная,
І роўных ёй — нідзе няма…

Марыя Шаўчонак, "Мая Радзіма"





Мастак Язэп Драздовіч

Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты - мой, я - твой: ад роду і навек.
Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю
Твой ліст дубовы - як чароўны лек.

За хлеб, што ем, за песні, што
спяваю,
За шчасце звацца іменем тваім -
Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты - мой, я - твой: усюды і ва ўсім!

Ніл Гілевіч, "Паклон табе,
мой беларускі краю!"





Мастак Віктар Крук

**Беларусь, мая шыпшына,**
**Зялёны ліст, чырвоны цвет,**
**У віхры дзікім не загінеш,**
**Чарнобылем не зарасцеш.**

**Пялёсткамі тваімі стану,**
**На дзіды сэрца накалю,**
**Тваіх вачэй пад колер сталі**
**Праменне яснае люблю…**

**Уладзімір Дубоўка, "О Беларусь, мая шыпшына"**





Мастак Павел Татарнікаў

Беларусь, Беларусь – гэты зык
Паліць душу маю, як агнём.
Я не ведаю, чым ён вялік,
Але думак не змог я аб ём.
Як пачую яго, задрыжыць
Маё сэрца, заные ў грудзях,
І балюча так робіцца жыць,
І шукаеш чагосьці ў людзях.

Беларусь, Беларусь… гэтых слоў
Пойме музыку, хто ўсёй душой
Іх магутны, тужлівы іх зоў
Зловіць думкай сваёю жывой…

Уладзімір Жылка, "Беларусь"





Мастак Аксельрод Меер

Ты ляці, маё слова, праз палі і лясы,
Прывітайся з краінай маёй дарагою.
Беларусь, я — твой воін адданы і
сын,
Мае думкі і сэрца заўсёды з табою.
Ты мяне гадавала, ты мяне
калыхала,
Ты мне песні, як родная маці,
спявала,
Клапатліва збірала у шлях.
Як люблю я задумлівы шэлест бяроз,
Хвалі жыта, сьвятло перадранішніх
рос
На тваіх аксамітных лугох!..

Пімен Панчанка, "Беларусі"






Мастак Сяргей Давідовіч-Зосін

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню
пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць
варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх
дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі
Дняпро.

Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць
ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы
карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам,
як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў
да цябе...

Уладзімір Караткевіч,
"Беларуская песня"






Без сонейка свету не быць,
без мілага нельга жыць…

Радзімы вецер!
Ён з усіх вятроў
Мне як натхненне,
Як шчаслівы подых.
Ёсць доўгі шлях,
Дзе мы,
Як параходы,
Вяртаемся
Да родных берагоў.
Удалечыні
Прыйшлося столькі жыць
І слаць сябрам
Паклоны у канверце...
Ёсць міг такі,
Калі не страх памерці,
А страх —
Цябе сабой не засланіць.

Яўгенія Янішчыц, "Бацькаўшчыне"





Мастак Вольга Навіцкая

Многа слаўненькіх куточкаў
Ёсць у нашым краі,
Дзе пад гоман ручаёчкаў,
Пад шум дрэў у гаі

Рой журботных дум пакінеш;
Дзе няма трывогі,
Дзе душою адпачынеш,
Змучаны з дарогі;

Дзе прыемны ветрык млее,
Збажыну калыша,
Дзе пакоем-згодай вее,
Дзе ўсё шчасцем дыша.

Якуб Колас,
"Многа слаўненькіх куточкаў"





Мастак Павел Татарнікаў